Беларуская мова і мовазнаўства: XIX стагоддзе / пад агул. рэд. М.Р.Прыгодзіча. – Мінск: БДУ, 2013. – 147 с.

Сярод актуальных праблем сучаснай беларускай лінгвістыкі асобнае месца належыць гісторыі беларускай мовы, паколькі яе вывучэнне мае як тэарэтыка-практычнае, так і грамадска-палітычнае і грамадска-культурнае значэнне. Нягледзячы на тое, што асобныя звесткі пра станаўленне і развіццё беларускай літаратурнай мовы падаюцца практычна ў кожным падручніку, прызначаным навучэнцам устаноў агульнай сярэдняй і вышэйшай адукацыі, грунтоўных прац і вучэбных дапаможнікаў, прысвечаных гісторыі беларускай мовы ў розныя перыяды яе існавання не так і многа. Маладаследаваным застаецца цэлы шэраг праблем, у тым ліку і пытанні функцыянавання беларускай мовы ў XIX стагоддзе, у перыяд станаўлення і развіцця новай беларускай літаратурнай мовы. У сувязі з гэтым заканамернай з'яўляецца цікавасць да манаграфіі “Беларуская мова і мовазнаўства: XIX стагоддзе”, створанай калектывам аўтараў (І.А.Гапоненка, А.А.Грыгаровіч, С.М.Запрудскі, В.П.Красней, Г.І.Кулеш, М.І.Свістунова, Н.К.Ціванова), які ўзначаліў доктар філалагічных навук, прафесар М.Р.Прыгодзіч.

У прадмове адзначаецца, што гэта манаграфія – “спроба асэнсаваць асобныя моманты і палажэнні з гісторыі беларускай мовы і мовазнаўства XIX ст., па магчымасці паглыбіць нашы ўяўленні аб адметных напрамках у працэсе станаўлення беларускай літаратурнай мовы, вызначыць ролю асобных філолагаў у развіцці лінгвістычнай думкі таго часу”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Структура манаграфіі падпарадкавана дасягненню пастаўленай мэты. Кожная глава працы прысвечана асвятленню аднаго з аспектаў праблемы. Трэба адзначыць, што матэрыялы, прадстаўленыя ў манаграфіі, з'яўляюцца вынікамі ўласных аўтарскіх навуковых.

Глава першая "Асаблівасці станаўлення беларускай літаратурнай мовы ў XIX ст." ілюструе канкрэтным фактычным матэрыялам тэарэтычнае палажэнне пра дыялектную аснову новай беларускай літаратурнай мовы. Г.К.Ціванова і В.П.Красней у двух першых раздзелах манаграфіі раскрылі спецыфіку моўнай сітуацыі на Беларусі ў XIX стагоддзі, ахарактарызавалі графічныя сістэмы, якія выкарыстоўваліся ў той час носьбітамі беларускай мовы, падрабязна разгледзілі фанетычныя і граматычныя асаблівасці першых пісьмовых беларускіх помнікаў, сярод якіх "Камедыя" К.Марашэўскага, творы Я.Баршчэўскага, Я.Чачота, В.Дуніна-Марцінкевіч і інш.

Глава другая "Развіццё лексічнай і графіка-арфаграфічнай сістэмы беларускай мовы XIX ст." ставіць на мэце паказаць распрацаванасць лексічнай сістэмы, крыніцы яе папаўнення і даказаць здольнасць беларускай мовы забяспечваць зносіны ў розных сферах чалавечай дзейнасці. І.А.Гапоненка акцэнтуе ўвага на запазычаных словах і праблеме іх асваенне моўнай сістэмай, на шляхах папаўнення мовы абстрактнай лексікай, на развіцці тапаніміі і антрапаніміі. Г.І.Кулеш спынілася на разглядзе праблемы станаўлення заканадаўчай тэрміналогіі. Асобныя раздзелы, аўтарамі якіх з'яўляюцца І.А.Гапоненка і А.А.Грыгаровіч, прысвечаны разгляду графіка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

арфаграфічнай спецыфікі беларускіх выданняў XIX стагоддзя, перш за ўсё газеты “Мужыцкая праўда” Кастуся Каліноўскага.

Глава трэцяя “Беларускай мова як аб’ект лінгвістычных даследаванняў” прысвечана адной з маладаследаваных праблем у гісторыі беларускай мовы. У прыватнасці, С.М.Запрудскі выяўляе і аналізуе розныя назвы беларускай мовы, якія сустракаюцца ў працах даследчыкаў XIX стагоддзя. М.І.Свістунова знаёміць чытачоў з поглядамі ўніяцкіх святароў на беларускую мову. М.Р.Прыгодзіч падрабязна асветляе дзейнасць Паўла Шпілеўскага і Івана Насовіча.

У цэлым адзначым, што ўсе вывады і тэарэтычныя палажэнні, зробленыя аўтарамі манаграфіі, падмацаваны грунтоўным аналізам моўнага матэрыялу. Пра многія моўныя факты шырокае кола чытачоў даведваецца ўпершыню.

У выніку манаграфія стварае шматгранную, яркую і, галоўнае, прадметную карціну моўнай сітуацыі на Беларусі XIX стагоддзя, яскрава раскрывае ролю розных выданняў і асобных аўтараў у графічным, арфаграфічным, лексічным станаўленні беларускай мовы, прадстаўляе беларускую мову XIX стагоддзя як аб’ект навуковага даследавання.

Манаграфія “Беларуская мова і мовазнаўства: XIX стагоддзе” будзе цікавай у першую чаргу тым, хто займаецца праблемамі гісторыі беларускай мовы, але будзе карыснай і шырокаму колу чытачоў – студэнтам філалагічных спецыяльнасцей, аспірантам, навучэнцам класаў з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

паглыбленым вывучэннем мовы, выкладчыкам, а таксама ўсім, хто цікавіцца гісторыяй беларускай мовы.

Рэцэнзенты –
кандыдаты філалагічных навук, дацэнты кафедры беларускага і рускага мовазнаўтва — В.У.Азарка, А.С.Васілеўская

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ